БРЫЛЁЎСКІ ЛЕТАПІС

№ 21 (103)
чэрвень
2009 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца з мая 2006 г.

ПАМІНКАТ.ОРГ

Дагляд і дапамога

25 чэрвеня 2009 года адбылося чарговае паседжанне выканкама Брылёўскага сельскага Савета. Галоўнае пытанне - "Аб выкананні мерапрыемстваў па рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта РБ № 18 "Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей ў непаспяховых сем'ях".

Старшыня выканкама Уладзімір Ільіч Мажораў у сваім выступе адзначыў, што на тэрыторыі Брылеўскага сельсавета налічваецца 120 дзяцей школьнага і 53 дашкольнага ўзростаў. Яны навучаюцца ў Кадзінскай САШ, Мастоцкай САШ, у Брылеўскай школе-садзе і Макаранскім дзіцячым садзе. У сацыяльна небяспечным становішчы ў нас знаходзіцца дзве сям'і -- Н.І.Яблонскай і М.В.Шулавай. На ўнутрышкольным ўліку стаяць сем'і Велікана-вай Г.М., Жукавай К.М., Кунусавай Н.А., Малдаванавай Н.І., Мартынавай А.І., Меляшковай Н.А., Паршнёвай Р.Г., Пятровай С.Д., Старс В.М. У працы з непаспяховымі сем'ямі ёсць некалькі накірункаў. Гэта дзейнасць сацыяльных педагогаў -- Шагойка І.І. (Кадзіна), Рубцовай Л.А. (Масток) і Ярмаш Н.А. (Брылі). Пры сельвыканкаме створана камісія па справах непаўналетніх, у склад якой уваходзіць 6 чалавек -- старшыня і сакратар выканкама, сацыяльныя педагогі, і нспектар ІІСН Магілёўскага РАУС. Камісія праводзіць свае паседжанні, на якія запрашаюцца бацькі, чые дзеці зрабілі тыя ці іншыя правапарушэнні. За палову 2009 года праведзена 3 паседжанні камісіі. Членамі камісіі адбываюцца рэгулярныя наведванні непаспяховых сем'яў. Але трэба адзначыць, што і паседжанняў камісіі, і падобных наведванняў недастаткова. Аптымальным было б, каб паседжанні праводзіліся штомесячна. Трэба таксама адзначыць, што наведванні трэба рабіць не паасобна, як гэта робіць Брылеўская школа-сад, а сумесна з усімі зацікаўленымі ўстановамі і арганізацыямі. У гэтым пытанні патрабуецца большая каардынацыя намаганняў.

У.І.Мажораў

Н.І.Рамашкевіч

А.М.Яцкова

А.М.Сілкоў

Дырэктар Брылеўскай школы - сада Наталля Анатольеўна Ярмаш падкрэсліла, што дзеці з "праблемных" сем'яў заўсёды знаходзяцца пад пільнай увагай настаўнікаў. З бацькамі таксама вядзецца мэтанакіраваная і карпатлівая праца.

Участковы Магілёўскага РАУС Валерый Васільевіч Маскалёў удакладніў, што работа ў патрэбным накірунку ў нашым рэгіёне вядзецца комплексна, з удзелам усіх зацікаўленых бакоў. І ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Магілёўскага раёна агульная карціна ў нас дастаткова станоўчая.

Н.А.Ярмаш

В.В.Маскалёў

Па абмеркаванаму пытанню была прынята адпаведная пастанова.

Сакратар выканкама Надзея Іванаўна Рамашкевіч праінфармавала аб іншых надзённых пытаннях жыцця сельсавета, па якіх былі прынятыя адпаведныя рашэнні.

МЯ

"Вызывайце МЧС!"

З.У.Раманава: "Не ведаем, што і рабіць..."

Зінаіда Уладзіміраўна і Уладзімір Сідаравіч Раманавы, што жывуць у Брылях па вуліцы Кастрычніцкай, 22, шмат што бачылі на сваім вяку. Але вось такое ім прыйшлося перажыць упершыню. Па-першае, трапілі ў страшэнны ўраган, што бушаваў над Брылямі 11 чэрвеня. А, па-другое, сутыкнуліся з абыякавасць з боку ўсіх службаў, якія займаліся ліквідацыяй наступстваў стыхіі. А справа ў тым, што побач з іх домам вецер паваліў ліпу, якая перагарадзіла вуліцу і падыходы да дому. Як бачна на фотаздымках, дрэва мае ўнушальныя памеры і сіламі двух пенсіянераў тут яўна не абысціся. Калі прыехала брыгада "Электрасетак" і пачала ўзнаўляць пашкоджаную лінію электраперадач, Зінаіда Уладзіміраўна звярнулася да мантажнікаў, каб яны і гэта дрэва дапамаглі ўбраць. Тыя паглядзелі і сказалі, што ліпа правады не зачапіла, таму брацца за гэту справу яны не будуць, і трэба званіць у сельсавет. З.У.Раманава пазваніла ў сельсавет і пачула ад старшыні выканкама У.І.Мажорава, што сельсавет не мае магчымасці займацца гэтай праблемай і што трэба тэлефанаваць у МЧС -- няхай едуць і дапамагаюць, бо гэта іх справа. Званіць у МЧС пенсіянерка не стала, бо зразумела, што, як кажуць у народзе, *"спасение утопающих -- дело рук самих утопающих"*. Так і ляжала гэтая ліпіна больш за два тыдні, пакуль у справу не ўмяшалася дэпутат Брылеўскага сельсавета А.М.Яцкова. Па яе асабістай просьбе да дому Раманавых пад'ехалі А.М.Сілкоў, В.У.Вараб'ёў і М.А.Карнееў і добра папрацавалі бензапілой -- абрэзалі галлё і распілавалі ствол. Справу завершылі працаваўшыя непадалёк лесарубы, якія спачатку запрасілі 30 тысяч рублёў за труды, а потым згадзіліся папрацаваць за 20 тысяч. Прыйшлося Зінаідзе Уладзіміраўне вымаць свой не вельмі тоўсты пенсіянерскі кашалёк і аддаваць тыя грошы. А што рабіць?..

"Ваенны савет" -- У.С.Раманаў, З.У.Раманава і А.М.Яцкова.

З аднаго боку ўсё правільна: платная паслуга. Але, з другога боку, не было б таго ўрагану -- стаяла б тая ліпа яшчэ столькі гадоў. Адбылося стыхійнае бедства. І не Раманавы тое дрэва павалілі. І калі нікому з тых, у каго ёсць паўнамоцтвы, няма ніякай справы да вось такіх турбот *"простага"* чалавека, то, відаць, нешта не так у нашым грамадстве.

Мікола ЯЦКОЎ.

Служба ЖКГ вырашыла пазбавіць жыхароў дома № 6 па вул.Юбілейнай у Брылях ад традыцыйнай лужыны шляхам утварэння вось такой "пясочніцы" (злева). Пасля чарговага дажджу пясок некуды змыўся, а лужына засталася (справа). Відаць, месца тут такое -- анамальнае...

Справаздачны канцэрт

*Просторы
Приднепровья…
Земля
родная наша…
И город векопомный
всему названье дал…
Район наш Могилёвский…
И нет на свете краше:
Он - центр притяженья,
Начало всех начал...»*

Такімі чулымі словамі 20 чэрвеня 2009 г. у Брылёўскім Доме культуры пачаўся справаздачны канцэрт калектываў мастацкай самадзейнасці. Сёлета ён быў прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі і 85-годдзю ўтварэння Магілёўскага раёна. Гледачы пазнаёміліся з тым лепшым, што стварылі самадзейныя артысты за год, што мінуў з апошняй справаздачы. І разам з артыстамі з хваляваннем прамаўлялі:

*“...Мы были,
есть,
мы будем -
И с песнями, и с хлебом!
И аисты на крыльях
Нам Вечность принесут!..”*

М.Я.

Дар’я Саўчына і група падтрымкі

Любоў Шастакова


Гледачы

Настасся Саўчына

Вікторыя Лазарава


Юлія Ярмаш

Крысціна Ляутка


Вольга Вараб’ёва

Сцэнка

Вольга Вараб’ёва і Кацярына Арцёмава

Вольга Майбурава

Ала і Мікалай Яцковы

КАЛІНІНСКАЕ

Трыо Таццяна Пшанічная, Олія Ярмаш і Настасся Саўчына

Крысціна Ляутка ў беларускім строі

Танец “Калина”

Фінальная песня

Прыгажосць - з утыцю

У праграме навядзення парадку на зямлі важнае месца адводзіцца выхаванню эстэтычнага густу жыхароў. Так званыя “малыя формы” паступова асвойваюць навакольную прастору нашых населеных пунктаў. Не абмінулі гэтыя новаўвядзенні і нашы Брылі. Недзе новыя пабудовы робяць з дарагіх матэрыялаў (дрэва, камень), але майстры нашага ўчастка ЖКГ пайшлі шляхам вяртання жыцця тым рэчам, якія адслужылі сваё. І ў двары дома № 8 па вуліцы Юбілейнай з’явіліся вось такія клумбы, зробленыя са старых трактарных колаў. Аказваецца, колы гэтыя бываюць патрэбныя не толькі ў ноч на Купалле, але і для больш цікавага, прыгожага і доўгага жыцця. Будзем спадзявацца, што паступова ў кожным двары нашага гарадка зазіхаціць такая вось прыгажосць.

Ала ЯЦКОВА,
бібліятэкар Брылеўскай бібліятэкі.

Наталля Жылянкова, Віталь Вараб’ёў і Кастусь Калячкоў ля новай клумбы.

Вожык пратупацеў

Менавіта вось такой цёплай парой яны з'яўляюцца побач з намі -- бегаюць, тапочуць сваімі лапкамі, шамоцяць лісцем, фыркаюць і нават клацаюць зубамі. Яны адзіночкі. У кожнага вожыка ёсць свая кармавая тэрыторыя ад 7 да 40 га (!). Так што, убачыўшы такога калючыка на брылёўскай вуліцы, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што вёска наша знаходзяцца ў сферы ягоных інтарэсаў і нікуды ён адсюль не пойдзе.

А дзецям цікава пабачыць ляснога госця, дакрануцца да ягоных іголак і пачуць фырканне -- не вельмі задаволенае. Бываюць выпадкі, калі вожык робіцца амаль хатняй жывёлай. Як гэта было ў Юліі Ермалаевай: кожны дзень вожык прыходзіў да яе -- падкарміцца. Юлю зусім не баяўся, і, здавалася, вельмі добра разумеў -- што пра яго кажуць і як да яго ставяцца...

Рэгіна Жукава, Святаслаў Меляшкоў і Андрэй Жукаў з вожыкам.

Антон Майбураў упершыню ў жыцці ўбачыў вожыка.

А ўжо ў жніўні вожык пачынае класціся ў спячку. І знікае ў сваіх чароўных снах аж да вясны. Каб цёплай парой нанова пачаць тупацець, шамацець, фыркаць і нават клацаць зубамі.

Мікола ЯЦКОЎ.

Юлія Ермалаева са сваім калючым сябрам.

КАМУНІКАТ.ОРГ

БРЫЛЁЎСКАЯ БІБЛІЯТЭКА ІНФАРМУЕ

НЕМАН

№ 6, 2009 г.

У мерапрыемствы па "навядзенню парадку на зямлі" ўваходзіць такая рэч, як знішчэнне ў вёсках "безгаспадарчых" хат і пабудоў. Паэт Віталь САВІЦКІ па-свойму адрэгаваў на гэтыя вясковыя перамены:

* * *

Віталь Савіцкі

Их убирают, бесхозные хаты,
Рушат бульдозером,
прямо на слом.
И, как сражённые в битве
солдаты,
Валятся наземь деревья
кругом.
Рушат с азартом,
старательно, лихо –
Что тут миндальничать?
К чёрту хламьё!
Пыль вековая вздымается тихо,
И не стихает в садах вороньё.
К чёрту иконы, гармошки и кросны,
Запах скотины и дух старины,
Санный разбег, хороводные вёсны...
Требует, требует быт новизны!
Сносятся хаты...
А деды, старухи –
В вечной обители, что за селом.
Благо, не ведают этой разрухи,
Благо, не смотрят на этот погром...

Цытата

Я ненавижу ваши мысли, но я готов отдать жизнь за то, чтобы вы могли их высказать.

Вольтер, французский философ.

ДРУЖЕНТЫ И ФАКТЫ

24.06.2009 г.

Геннадий Зюганов

Геннадий ЗЮГАНОВ, лидер КПРФ: «...С чего началась Февральская революция знаете? Я просмотрел все газеты за январь 1917-го -- ни слова о возможности переворота. Даже Ленин писал: "В России всё глухо, революции не предвидится". И вдруг – началось. Бабам на Невском проспекте, которые пришли с детьми на руках за хлебом, не хватило по булке. Они взбунтовались -- кормить детей нечем! Можно было подавить этот бунт. Но полицмейстер Петрограда, когда к нему пришли, ответил: "С бабами воевать не буду!"».

Петроград. Февраль 1917 г.

ЗВЯЗДА

13.06.2009 г.

ЗЯЗЮЛЯ

- У шматлікіх народаў зязюля сімвалізавала надыход вясны і прадказвала будучыню: *"Зязюля, зязюля, скажы, колькі гадоў мне жыць?"*. Па народных уяўленнях, колькі разоў зязюля пракуе, столькі чалавеку, які варажыў, гадоў пражыць засталося. Вясной, калі чулі першы голас зязюлі, нашы продкі раілі бразгацець манетамі (ключамі) у кішэні, каб увесь год быць з прыбыткам. Зязюля таксама была сімвалам дрэннай маці з той прычыны, што яна не даглядае сваіх птушанят, а падкідвае яйкі ў гнёзды іншых птушак.
- Калі зязюля закуе на ўзыходзе сонца і на "зялёным" дрэве, год будзе ўраджайным; калі закуе ўвечары і на "голы" лес – чакай бяды і няўроду.
- Пачуць салаўя раней за зязюлю – да ўдалага года, наадварот – да нешчаслівага.
- Зязюля прыносіла цяпло з выраю, таму лічылі: *"Пакуль зязюля не заспявае, купацца нельга"*.
- Калі ўвесну пачуеце голас зязюлі справа -- вам увесь год будуць спрыяць удача, поспех ва ўсіх справах; калі злева – поспехаў не чакай.
- Калі вы чуеце зязюлю справа, загадайце самае патаемнае жаданне, і яно абавязкова здзейсніцца ў гэтым годзе.
- Магічнымі якасцямі ў народзе надзялялі пер'е зязюлі і тую галінку, на якой яна сядзела і кувала. Яе спілоўвалі і насілі пры сабе яе абярэг.
- Каб муж з жонкай не сварыліся, іх паілі адварам кораня расліны з прыгожай назвай "зязюльчыны слёзы".
- Зязюля заканчвала свой спеў на пачатку жніўня. Гэты момант ў народзе звязвалі з часам каласавання жыта, пшаніцы і аўса. Таму казалі: *"Зязюля змоўкла – жытным зернем падавілася"*.
- Калі зязюля пачынала куваць над хатай, гэта прадказвала смерць каго-небудзь са сваякоў ці іншую непрыемнасць (пажар, мор жывёлы, няўрод і г.д.).

ДРУЗЬЯМ С ЛЮБОВЬЮ

Давайте жить всегда теплом надежды!
По жизни оптимистом надо быть.
Не мучиться порой тоской безбрежной,
А вычеркнуть плохое и забыть!
Давайте делать всем вокруг презенты:
Дарить цветы, подарки, пылкий взгляд,
Преподносить любимым копмлименты --
И встрече с вами каждый будет рад.
Давайте жить без горя и печали,
Улыбкой озаряя всех друзей!
Всем сердцем только нежность излучая,
Давайте жить и радовать людей!

(Неизвестный автор).

Прозвішча падпісчыка

Імгненні

Вызірнула сонейка і кошка Мурка, паважна рассеўшыся, вырашыла пагрэцца, а заадно і папільнаваць гаспадарскі дроўнік. *27 чэрвеня 2009 г.*

Усё імкнецца да неба, у бязмежную прастору. І нават калі жыццё адлятае і зямныя сокі ўжо не віруюць у жылах, усё роўна імкненне быць бліжэй да аблокаў застаецца. *27 красавіка 2009 г.*

Бусел з суседняй воданапорнай вежы штодзень па-гаспадарску аглядае сваю тэрыторыю. *21 чэрвеня 2009 г.*

Фота М.Яцкова

Ад учэпістасці і моцы тваіх каранёў залежыць, наколькі ты будзеш непахісным, упэўненым і стойкім пад сцюдзёнымі жыццёвымі вятрамі. Уся сіла -- ад роднай зямлі. *10 мая 2007 г.*

“БРЫЛЁЎСКІ ЛЕТАПІС”
Инфармацыйна-грамадскі бюлетэнь.
Заснавальнік - М.А.Яцкоў
Выдаецца з мая 2006 г.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 100 асобнікаў.

Адказны за выпуск -
Мікалай Адамавіч ЯЦКОЎ
На правах рукапісу.
Пры перадруку матэрыялаў
спасылка на “Брылёўскі летапіс” абавязковая.
© “Брылёўскі летапіс”, 2009

Звярстана і надрукавана
на прыватным абсталяванні.
Адрас: 213107 Магілёўскі раён, в.Брылі,
вул. Юбілейная 6 - 7
тэл. маб. +375293732886
e-mail: bryli@mail.ru